УДК 930 (476+477)

***Барсук А. Я. (Мазыр, Беларусь)***
***Федарэнка М. А. (Мікалаеў, Украіна)***

# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА БЕЛАРУСКІХ І ЎКРАІНСКІХ ЗЕМЛЯХ У XVI – XVIII СТСТ.: ПАРАЎНАЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

*Выяўлены агульныя і асобныя характарыстыкі сацыякультурных працэсаў на беларускіх і ўкраінскіх землях на працягу XVI – XVIII стст., вызначана, што агульнымі прыкметамі развіцця з'яўляюцца: тагачасныя еўрапейскія тэндэнцыі, уплыў ідэалогіі сарматызму і мадэрнізацыі, уздзеянне на фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці заходнееўрапейскай і ўсходне-праваслаўнай культуры. Выключна ўкраінскай з'явай у XVII ст. было фарміраванне новага сацыяльнага саслоўя – казацтва – і існаванне аўтаномнай казацкай дзяржавы – Гетманшчыны. Украінскія землі ўваходзілі ў склад розных дзяржаўных утварэнняў, мелі розны ўзровень сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця.*

*Даследаванне ажыццяўлялася ў межах гранта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў.*

У XVI ст. беларускія і ўкраінскія землі апынуліся пад уплывам эпохі Рэнесансу і Рэфармацыі, але значна пазней, чым у краінах Заходняй Еўропы. Ідэі гуманізму змянялі характар і спосаб мыслення грамадскай эліты, пашыралі вальнадумства, зацвярджалі неабходнасць асветы і адначасова захавання ўласнай ідэнтычнасці. Тагачасны светапогляд чалавека характарызаваўся абавязковай наяўнасцю сакральнага, што тлумачыць вялізную ролю рэлігіі ў штодзённым жыцці грамадства. На думку даследчыкаў, гэтая акалічнасць увасаблялася ў цэхавой арганізацыі вытворчасці, дзейнасці брацтваў і нават у структуры і дзейнасці Запарожскай Сечы [1, с. 247; 2, с. 140]. У гэты час адбываецца фарміраванне і станаўленне новага сацыяльнага стану Украіны – казацтва, якое праяўлялася на пачатку ў шырокіх сялянска-казацкіх паўстаннях К. Касінскага і С. Налівайкі. Заклікі апошняга знаходзілі разуменне і ў беларускіх сялян.

Казацкая арганізацыя мела выбарнага "бацьку" і старшыну, радавых казакоў і "вучняў", сістэму прысвячэння і рытуалаў, што дазваляе параўноўваць яе з брацтвам. Сапраўдны казак адрозніваўся "ваярскім" шчасцем (амаль чарадзейскімі якасцямі)



МГПУ им. И.П.Шамякина

ад іншага насельніцтва. Адсюль вынікаў падзел на “сваіх” (ваяроў, воінаў нават чужой арміі) і “чужых” (усіх, хто не адносіўся да казацтва незалежна ад канфесійнай прыналежнасці і маёмаснага стану). Таму, па меркаванні Н. Якавенка, падчас казацкіх хваляванняў назіралася маштабнае вынішчэнне насельніцтва, якое разглядалася як “чужое”, і каштоўнасцей, што вызначала ваенны поспех [2, с. 140; 3, с. 72].

Рэфармацыя імкнулася аднавіць адзінства сакральнага на аснове Бібліі. Аднак у выніку рэформ царквы Еўропа страціла канфесійную еднасць і салідарнасць хрысціянскага свету, выклікала Контррэфармацыю і рэлігійныя войны, набыла неабходнасць новага разумення талерантнасці. На думку многіх даследчыкаў, менавіта гэтыя абставіны, падмацаваныя заняпадам царкоўна-славянскай асветы, падпарадкаваннем праваслаўнага духавенства свецкай уладзе, крызісам Кіеўскай мітраполіі і Канстанцінопальскага патрыярхату ўвогуле абумовілі магчымасць заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г. [1, с. 250]. Каталізатарам аб’яднаўчых працэсаў стала стварэнне Маскоўскага патрыярхату ў 1589 г. і пашырэнне ідэй “Масква – трэці Рым”, прадвызначанасці ў абароне праваслаўя. Аднак міжканфесійную ўнію 1596 г. нельга разглядаць толькі як вынік супрацьстаяння каталікі – праваслаўныя. Гэта былі наступствы ўплыву Рэнесансу, Рэфармацыі і Контррэфармацыі.

Неспрыяльныя ўмовы для функцыянавання праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай у XVI ст. не вызначалі страту яе пазіцый у грамадскім жыцці. Пашырэнне ўплыву каталіцтва і павелічэнне колькасці вернікаў-каталікоў на беларускіх і ўкраінскіх землях у складзе Рэчы Паспалітай не абмяжоўваліся толькі гэтай акалічнасцю. Вялікую ролю адыгралі ідэі Рэфармацыі, гуманізму і вольнадумства, а таксама інкарпарацыя праваслаўнай эліты ў польскую шляхту шляхам прыняцця каталіцтва і пераймання польскай культурнай традыцыі як магчымасць атрымаць дадатковыя прэферэнцыі ці рэалізаваць уласныя амбіцыі.

Рэфармацыйныя накірункі, асабліва кальвінізм, як і ў Малой Польшчы і Галіцкай Русі, атрымалі даволі значнае пашырэнне на тэрыторыі Беларусі, аднак, у адрозненне ад Заходняй Еўропы, пераважна сярод магнатаў і часткі шляхты. Адным са станоўчых вынікаў Рэфармацыі ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай стала заканадаўчае замацаванне свабоды веравызнання – спачатку ў Віленскім прывілеі Жыгімонта II Аўгуста 1563 г. і II Статуце ВКЛ 1566 г. Затым верацярпімасць заканадаўча была замацавана ў Акце Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г., поўны тэкст якога ўключаны ў III Статут ВКЛ [4, с. 118–120; 5, с. 38–39]. На думку ўкраінскага даследчыка І. Чахоўскага, гэтая прававая норма стала пэўнай падставай для падтрымання праваслаўнай шляхтай умоў Берасцейскай уніі [6, с. 17].

Падчас наступу Контррэфармацыі былая праваслаўная шляхта на беларускіх і ўкраінскіх землях, што падтрымала пратэстантызм, перайшла ў каталіцтва. Зразумела, што гэта адмоўна адбілася на станаўленні нацыянальнай царквы і адпаведна на фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці [1, с. 253]. Акрамя таго, у выніку пашырэння ўніяцтва на пачатку XVII ст. быў фактычна ліквідаваны прынцып верацярпімасці, што абвастрыла міжканфесійныя супярэчнасці і стварыла магчымасць выкарыстання лозунга абароны “веры продкаў” у палітычнай барацьбе розных сацыяльных сіл. Так, казацтва адкрыта выступіла ў абарону праваслаўя. Дзякуючы падтрымцы гетмана Запарожскай Сечы Пятра Канашэвіча Сагайдачнага ў 1620 г. была адноўлена праваслаўная іерархія, а ў 1632 г. яна афіцыйна зацверджана каралём Рэчы Паспалітай Уладзіславам IV паводле “Артыкулаў заспакаення народу грэчаскай рэлігіі”. Паводле Збароўскай дамовы 1649 г., паміж Б. Хмяльніцкім і Рэччу Паспалітай унія касавалася ў межах Гетманшчыны. Канфесійныя супярэчнасці выклікалі палітычнае, сацыяльнае і культурнае супрацьстаянне ў Рэчы Паспалітай і за яе межамі. Таму праціўнікі ўніі пачалі разлічваць на падтрымку і абарону сваіх інтарэсаў з боку аднаверцаў – Маскоўскай дзяржавы, што, у сваю чаргу, абумовіла абвастрэнне канфрантацыі паміж

МГПУ им. И.П. Шамякина

дзяржавамі не толькі ў знешнепалітычным аспекце, але і сацыякультурным – сутыкненне дзвюх цывілізацый – заходняй і ўсходняй. Рэч Паспалітая – шматэтнічная і поліканфесійная дзяржава з перавагай лацінскага рацыяналізму і пашырэннем ідэй гуманізму і вольнадумства. Руская дзяржава – маналітная аўтакратыя з саборнасцю, містычнай набожнасцю і неаформленым фальклорам [1, с. 255]. Канфесійнае пытанне выкарыстоўвалася ў якасці "баявога сцяга" падчас ваенных падзей 1648 – 1654 гг. і 1654 – 1667 гг. на Беларусі і Украіне і напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай, падчас стварэння Торуньскай пратэстанцкай і Слуцкай праваслаўнай канфедэрацый у 1767 г., што дазволіла іншаземцам умяшацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай.

Украінская гістарыяграфія разглядае падзеі сярэдзіны XVII ст. ад рамантычнай герацізацыі сялянскай вайны і рэлігійнага супрацьстаяння да барацьбы за нацыянальную незалежнасць і стварэння дзяржавы, ад супрацьпастаўлення польскай і ўкраінскай культуры да бітвы за ўз'яднанне з адзінакроўным рускім народам [1, с. 258].

У беларускай гістарыяграфіі падзеі 1648–1651 гг. (да Белацаркоўскага пагаднення) вызначаюцца як казацка-сялянская або антыфеадальная вайна, па сутнасці сацыяльны пратэст, падтрыманы казакамі, і 1654 – 1667 гг. – вайна Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай, падчас якой значная частка Беларусі была акупавана, што выклікала моцны народны супраціў. Гэта была дэмаграфічная катастрофа, наступствы якой не былі пераадолены нават да канца XVIII ст. Беларусы сталі народам з няпоўнай сацыяльнай структурай [7, с. 93].

Вынікі гэтых драматычных падзей для абедзвюх краін былі рознымі за выключэннем вялізарных людскіх і матэрыяльных страт. Беларусь засталася ў складзе Рэчы Паспалітай, казацтва як сацыяльная з'ява не мела самастойнага характару і разглядаецца толькі ва ўзаемадзеянні з падзеямі Хмяльніччыны, Руіны і гайдамацкага руху. Украіна – падзялілася на Левабярэжжа і Правабярэжжа. Адбыўся таксама сацыякультурны раскол грамадства на два паралельныя накірункі: статычную народную культуру, заснаваную на традыцыйным ладзе жыцця, і шляхецкую, арыентаваную на дасягненні заходнееўрапейскай думкі і асветы. Грамадства, асабліва ўкраінскае, дзякуючы існаванню Гетманшчыны і герацізацыі казацтва, таксама вызначалася па знешніх арыенцірах – на Польшчу, Расію ці захаванне мясцовых асаблівасцей [1, с. 259].

У такіх умовах галоўную камунікацыйную ролю павінна выконваць мова, якая адначасова дазваляе захоўваць уласную ідэнтычнасць, вызначаць "сваіх" і "чужых", акрэсліваць сваю адметнасць [8, с. 13–14].

Ва ўкраінскай гістарыяграфіі апошнім часам распрацоўваецца феномен памежжа (кардону) тэрытарыяльнага і культурна-сацыяльнага, які наклаў значны адбітак на фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці ўкраінцаў [9, с. 351–352]. Інакш кажучы, асноўнымі фактарамі фарміравання культурнай ідэнтычнасці з'яўляюцца: традыцыі і ўяўленні; этнагенетычныя міфы (пра паходжанне, гісторыю, культуру), усведамленне адзінства грамадства і яго самабытнасці, тэрытарыяльных і сацыякультурных межаў, наяўнасць агульнай рэлігіі і мовы зносін; уяўленні пра "іншае", яго параўнанне ці супрацьпастаўленне [1, с. 261]. Спецыфіка Украіны – у памежным, прыкардонным, пагранічным становішчы, буфернай ці кантактнай зоне паміж Захадам і Усходам. Гэта не толькі геаграфічная мяжа, але і мяжа сутыкнення розных уладных структур дзяржаў і ментальных уяўленняў (геапалітычная і геаэканамічная арганізацыя прасторы, уладна-палітычныя і культурна-сімвалічныя механізмы: адміністрацыйная сістэма, адукацыя. армія, царква, уяўленні пра ўласную гісторыю і геаграфічную прастору) [10, с. 4].

Польская гістарыяграфія вызначае становішча Польшчы ў XVI – XVIII стст. таксама паміж Захадам і Усходам, як прадстаўніка заходнееўрапейскіх каштоўнасцей і абаронцу ад асманскай экспансіі, што станоўча ўплывала на ўсе "рускія" землі, якія ўваходзілі ў склад ВКЛ і Рэчы Паспалітай [11, с. 31–32].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Неабходнасць узаемадзеяння на памежных тэрыторыях вызначала магчымасць выпрацоўкі новых форм салідарнасці, але і захавання ўласнай самабытнасці ці супрацьстаяння “іншаму”, што садзейнічала фарміраванню асобнага геаграфічнага субрэгіёна. У пэўнай ступені вызначаныя асаблівасці нацыянальнай ідэнтычнасці ўкраінцаў маюць дачыненне і да беларусаў, якіх таксама некаторыя даследчыкі вызначаюць як нацыю памежжа [12; 13].

Такім чынам, можна казаць пра тое, што беларуская і ўкраінская культура на працягу стагоддзяў знаходзіліся пад уплывам рознанакіраваных сацыяльна-палітычных, канфесійных, філасофска-прававых накірункаў. Вялікую ролю адыгрывалі ў традыцыйнай культуры беларусаў і ўкраінцаў сакралізацыя мадэлі свету і міфалагізацыя этнічнай гісторыі, што найбольш яскрава вызначаюцца ў вуснай народнай творчасці і мастацкіх творах [1, с. 264].

Ідэалогія сарматызму таксама адыграла значную ролю ў самавызначэнні “рускага народу” ў Рэчы Паспалітай і вызначала стыль жыцця і спосаб мыслення шляхты Рэчы Паспалітай (Вялікай Сарматыі), дзяржавы вольнасцей шляхецкіх. Склаўся агульны ўзорны вобраз сармата – патрыёта сваёй дзяржавы і шляхецкага стану, храбрага рыцара, красамаўнага аратара, абаронцы грамадскіх інтарэсаў незалежна ад уласных амбіцый, гасціннага, шчырага, годнага, свабоднага чалавека, перакананага ў сваёй культурнай, палітычнай і нацыянальнай выключнасці. Большая частка шляхты, пераважна сярэдняй і дробнай, прытрымлівалася адных і тых перакананняў, грамадскіх і палітычных поглядаў, цытавала тых жа аўтараў. Агульныя шляхецкія прывілеі, удзел у адзіных формах палітычнага жыцця, уніфікацыя адукацыі абумовілі выпрацоўку агульнай ментальнасці і ідэалогіі незалежна ад этнічнай, канфесійнай прыналежнасці і маёмаснага стану. Сфарміраваўся міф аб выключнай ролі Рэчы Паспалітай у абароне хрысціянскіх каштоўнасцей [7; с. 150].

Украінскія землі з другой паловы XVII ст. знаходзіліся ў двух культурных колах – Расійскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай да канца XVIII ст., затым у Расійскай і Аўстра-Венгерскай імперыях, што выклікала сацыяльна-палітычныя і сацыякультурныя супярэчнасці, асабліва ў дачыненні да захавання былых прывілеяў, рэлігіі і мовы. Гэтыя ж супярэчнасці закраналі і беларускія землі, якія пасля падзелаў Рэчы Паспалітай цалкам увайшлі ў склад Расіі. Беларускія і ўкраінскія землі ў складзе Рэчы Паспалітай у XVIII ст. апынуліся пад культурным уплывам эпохі Асветніцтва, што ўсталёўвала неабходнасць асветы, рацыянальнасці ў адносінах да свету і рэлігіі.

Такім чынам, сацыякультурныя аспекты беларуска-ўкраінскага ўзаемадзеяння ў межах Рэчы Паспалітай складалі аснову працэсаў фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці, былі абумоўлены адзінай сістэмай права і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, канфесійнымі адносінамі і рэлігійнай палітыкай дзяржавы, вызначалі асноўныя накірункі грамадска-палітычнай думкі, знаходзіліся пад аднолькавым уплывам заходнееўрапейскай культуры падчас Рэнесансу, Рэфармацыі і Контррэфармацыі, а таксама Асветніцтва. Адметнасці сацыякультурных працэсаў на ўкраінскіх землях у тым, што яны ўваходзілі ў склад розных дзяржаўных утварэнняў (Каралеўства Польскае і Вялікае княства Літоўскае, Рэч Паспалітая і Расія, Аўстра-Венгерская і Расійская імперыі), мелі розны ўзровень сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця і адчувалі розныя культурныя ўплывы. Выключна ўкраінскай з’явай было фарміраванне новага сацыяльнага саслоўя – казацтва – і існаванне аўтаномнай казацкай дзяржавы – Гетманшчыны.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Калакура, Я. С. Українська культура: цивілізаційний вимір /Я. С. Калакура, О. О. Рафальський, М. Ф. Юрій. – К.: ІПіЕНД ім. І. Ф. Кураса НАН України, 2015. – 496 с.



МГПУ им. И.П. Шамякина

2. Яковенко, Н. Нарис історії України з найдавніших часів до кінця XVIII ст. / Н. Яковенко. – К.: Критика, 1997.

3. Яковенко, Н. У кольорах пролетарської революції / Н. Яковенко // Гуманітарний огляд. Вип. 3. – К.: Критика.

4. Акты, относящіеся к исторіи Западной Россіи, собр. и изд. археогр. Коммиссіею: в 5 т. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1846–1853 (АЗР). – Т.3: 1544–1587. – 1848.

5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г. / уклад. Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, Я. А. Юхо; рэдкал.: Т.І. Доўнар [і інш.]. – Мінск: Тэсей, 2003.

6. Чеховський, І. На шляху до віротерпимості: Варшавська конференція 1573 р. // Час. 2000. – 2004. – 29 квітня. – С. 17.

7. Гісторыя Беларусі: У 6 т. / Ю. Бохан, В. Голубеў, У. Емельянчык і інш.; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд) і інш. – Мінск.: Экаперспектыва, 2004. – Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). – 344 с.

8. Нагорна, Л. Національна ідентичність в Україні / Л. Нагорна. – К.: ІПіЕНД НАН України, 2002.

9. Скрицька, Н. Культурна ідентичність у контексті самовизначення // Наукові записки: НУ «Острозька академія». Серія культурології. – 2013. – Вип.12.

10. Фісун, О. Геоісторичне майбутнє українсько-російського кордону в контексті глобалізації та європейської інтеграції // Україно-російське пограниччя: формування соціального та культурного простору в історії та в сучасній політиці. Семінар. Харків, 11 квітня 2003. – Інститут Кеннана. Київський проект.

11. Шевченко, Н. В. «Ягеллонська спадщина» у світлі сучасних українських історичних студій // Історичний архів. Наукові студії: Збірник наукових праць. – Миколаїв: В-во МДГУ ім. Петра Могили, 2008. – Вип. 1.

12. Кравцевич, А. Белорусы: нация Пограничья /А. Кравцевич, А. Смоленчук, С. Токть. – Вильнюс: ЕГУ, 2011. – 212 с.

13. Криволап, А. Культурная идентичность в контексте Пограничья. Конструирование белорусского медиаландшафта / А. Криволап, Е. Матусевич. – Вильнюс: ЕГУ, 2008. – 230 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина